PolotskSU



**УДК 39 (476-22)**

# ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ НАРОДНАГА ДОЙЛІДСТВА БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ Ў ПЕРЫЯД ПАСЛЯВАЕННАГА АДНАЎЛЕННЯ

***А.В. Сумко***
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Рэспубліка Беларусь
e-mail: e.sumko@psu.by

*Разглядаецца спецыфіка аднаўлення сялянскіх сядзіб на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў першыя гады пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Вылучаюцца асноўныя праблемы і этапы аднаўлення жылых пабудоў вясковага насельніцтва. У якасці крыніц выступілі архіўныя матэрыялы і ўспаміны жыхароў рэгіёну.*
***Ключавыя словы:*** *сялянская сядзіба, народнае дойлідства, Беларускае Падзвінне, зямлянка, пасляваеннае аднаўленне, культура жыццезабеспячэння.*

# PROBLEMS OF RESEARCH OF FOLK ARCHITECTURE OF THE BELARUSIAN PODVINYE IN THE PERIOD OF POST-WAR RECONSTRUCTION

***A. Sumko***
Polotsk State University, Republic of Belarus
e-mail: e.sumko@psu.by

*The article deals with the specifics of the restoration of peasant estates on the territory of the Belarusian Podvinye in the first years after the end of the Great Patriotic War. The main problems and stages of restoration of residential buildings of the village population are highlighted. The sources were archival materials and memories of residents of the region.*
***Keywords:*** *peasant farmstead, Belarusian Podvinye, dugout, post-war reconstruction, life support culture.*

**Уводзіны.** Вялікая Айчынная вайна адбілася на ўсіх баках жыццядзейнасці насельніцтва Беларусі, якое вымушана было змагацца за выжыванне ў вельмі цяжкіх умовах. Адным з наступстваў ваенных дзеянняў і акупацыі было зруйнаванне жылога і гаспадарчага фонду. У надзвычай складаных умовах апынуліся жыхары тых раёнаў, дзе нацысты ў барацьбе з партызанамі праводзілі палітыку "выпаленай зямлі”. На тэрыторыі Беларускага Падзвіння, якое амаль супадае з тэрыторыяй сучаснай Віцебскай вобласці (з 1944 па 1954 год яна была прадстаўлена двумя абласцямі: Полацкай і Віцебскай), спусташальны характар наступствы вайны мелі для Асвейскага, Ветрынскага, Дрысенскага, Полацкага, Расонскага, Ушацкага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Сіроцінскага, Суражскага, Чашніцкага, Лёзненскага, Мяхоўскага раёнаў, якія былі ўключаныя ў лік 36 найбольш пацярпелых ад нацыстаў на тэрыторыі БССРР [1, л. 10]. Паводле архіўных звестак у Полацкай вобласці без прытулку засталіся 34% сельскага насельніцтва, Віцебскай – 37, 3 % - [1, л. 35]. Людзі былі вымушаны прыстасоўвацца

PolotskSU



да экстрымальных умоў і шукаць варыянты часовага жылля, выкарыстоўваючы ўсе наяўныя рэсурсы.

Праблема даследавання народнага дойлідства ў перыяд пасляваеннага аднаўлення і вызначэння яго спецыфікі ў сельскай мясцовасці амаль не распрацавана ў сучасным народазнаўстве. У навуковай літаратуры распісаны класічная тыпалогія народнага дойлідства з улікам тэрытарыяльных асаблівасцей без варыянтаў, характэрных для экстрымальных умоў паваеннага перыяду. Такія пытанні, як тэхналогія будаўніцтва часовага жылля, яго тэхнічныя параметры, прынцыпы ацяплення, асьвятлення, санітарна-гегіенічныя ўмовы і г.д. застаюцца па-за ўвагай дасследчыкаў. З аднаго боку, гэта абумоўлена невялікім комплексам наяўных дакументаў, а з другога тым, што пасляваенная рэчаіснасць, як драматычны перыяд беларускай этнічнай гісторыі, да гэтага часу не з’яўляўся прадметам даследавання айчыннай этналогіі.

**Асноўная частка.** Значная колькасць рэспандэнтаў у сваіх успамінах пра першыя пасляваенныя гады ўзгадваюць, што пасля вяртання на вызваленую тэрыторыю людзі сутыкнуліся з сітуацыяй суцэльнага спусташэння: “Прышлі з адступлення на сваю ўсадзьбу – усё згарэлае было, толькі трубы гэты коменныя. З яловых лапак мамка будку здзелала нам, пасадзіла як сабачанят, шэсць дзяцей” (Бешанковіцкі р-н) [2, с. 220]; “*А пасля вайны пачті нічога не было. Хата ўся разбіта была і вокнаў не было, нічога*” [3].

Пад часовае жыллё прыстасоўвалі бліндажы ваенных часоў ці партызанскія землянкі, у якіх жылі некалькі семей: “*Жылі ў акопе не адны, а потым тата зрабіў будку, абшыў саломай і жылі”* (Пастаўскі р-н)” [4]. У мястэчках, дзе пражывала да вайны яўрэйскае насельніцтва, у якасці часовага жылля выкарыстоўвалі мураваныя склепы: “(А вот вы сказалі, што чатыры хаты толькі ў Кублічах засталося, а дзе людзі жылі?*) - Ну дзе? У зямлянках жылі, у склепах, тут жа скляпоў многа..”* (Ушацкі р-н) [5].

У першыя гады пасля вызвалення зямлянкі, як часовае жыллё, былі рэаліяй найбольш пацярпелых раёнаў. “*Вярнуліся летам, голае ўсё, хаты не было, ні адной пастройкі не было. Сталі зямлянкі капаць*” (Расонскі р-н) [6]; *«Вярнуліся на папялішча. Зямлянкі былі зроблены ў вайну ў аврагу…*” (Асвейскі р-н) [7]. Летам 1945 г. толькі ў Віцебскай вобласці ў зямлянках, непрыстасаваных памяшканнях пражывала каля 20 000 сямей [8, с. 550].

Якасць часовага жылля залежыла магчымасцей той ці іншай вясковай сям’і: *“– Вот і всё, вот в землянках жывём, і всё. Землянка ў нас была, папа вырыў харошую такую землянку там, і вот там і цвыркуны гэты, там і мошкі, всё- всё. Ну і как бы, ну і жылі”* [9].

У якасці матэрыялаў для часовага жылля выкарыстоўвалі ўсе наяўныя рэсурсы, звычайна надбудоўваючы ацалелы вугал ці комін. Адным з распаўсюджаных варыянтаў было выкарыстанне ў якасці часовага жылля лазні, якая па сваіх параметрах больш падыходзіла да мадэлі хаты (сенцы, асноўны пакой і печка): “*А ў нас засталася баня, яна дальше была ад хаты. Баня была без крышы, травы нажалі, тады нямецкая землянка была і доскі. Мы тады нашлі цележку немецкую з пад арудій, разбітую, на той цележке прывалаклі тых дасочак. Ой, як цяжка было валачы па пяску* ”(Расонскі р-н) [6]. Так як лазні будаваліся на пэўнай адлегласці ад жылых і гаспадарчых пабудоў, а таксама ад дарогі, то яны звычайна былі самымі ацалелымі элементамі слянскай сядзібы.

PolotskSU



Табліца 1. – Даныя пра будаўніцтва жылых дамоў калгаснікаў у найбольш пацярпелых раёнах Полацкай вобласці [НАРБ: Ф. 4-п. Оп. 29. Д. 267, л.22-23]

| Раён | Спалена дамоў | Пабудавана і адноўлена домоў для калгаснікаў за 1944-45 гг. | Пабудавана ў 1946 г. (на 01.07.1946 г.) | Пражываюць у землянках |
|---|---|---|---|---|
| Полацкі | 4 295 | 1 760 | 71 | 881 |
| Ушацкі | 3 568 | 787 | 40 | 210 |
| Ветрынскі | 2 435 | 584 | 55 | 531 |
| Расонскі | 4 677 | 949 | 23 | 1 006 |
| Асвейскі | 3 510 | 188 | 58 | 1 865 |
| Дрысcенскі | 3 389 | 721 | 51 | 434 |
| Усяго | 21 874 | 4 939 | 298 | 4 927 |

Згодна з даведкай ад 1 чэрвеня 1948 г. у землянках Полацкай вобласці пражывала 4 927 сем'яў, у Віцебскай – 10 149 [1, л. 22].На тэмпах аднаўлення адбіваўся недахоп рабочых рук, цяглавай сілы, а таксама рэсурсаў у сям'і. Любоў Іванаўна, 1937 года нараджэння, узгадвае наступнае: "*Мы пасля вайны прыехалі ў сваю дзярэўню Зорку і жылі, абстраіваліся як маглі, усё было папалена. Сперва нейкую… хабітка такая была, аббілі жалеззем, тады пастроілі дом. Мне не прыйшлося ў тым доме жыць – замуж выйшла (вяселле было ў 1957 г. - аўт) і яшчэ дом не дакончылі, яшчэ мой мужык памагаў дзелаць. Пасля вайны цяжка было. О, ні каня не было, нічога не было, на сябе ўсё цягалі, рэзалі*." (Расонскі р-н) [10].

Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра існаванне пераходнага тыпу жылля. Першыя хаты, якія будаваліся ў перыяд пасляваеннага аднаўлення, былі невялікіх памераў і практычна былі пазбаўлены дэкаратыўна-мастацкага аздаблення (ліштвы, аканіцы). Акрамя гэтага адсутнічалі некаторыя элементы традыцыйнай вясковай сядзібы Беларускага Падзвіння, пераважна гаспадарчыя забудовы (гумно, стайня).

Для аднаўлення жылых і гаспадарчых пабудоў фарміраваліся адмысловыя будаўнічыя брыгады. Аднак архіўныя дакументы фіксуюць, што ў першыя пасляваенныя гады яны па загаду мясцовага кіраўніцтва іншы раз перакідваліся на калгасныя ці грамадскія праекты.Таму аднаўленне жылога фонду адбывалася павольнымі тэмпамі."*А дом пастроілі нескора.Сначала землянкі строілі. Ну не скора, таму што ані. Пачыналі нам строіць, калі ўжо некатарыя мужчыны вернулісь. Папа не вернуўся, ды многа не вернулісь*." (Міёрскі р-н) [11].

Партыйныя органы выказвалі незадавальнненне тэмпамі аднаўлення жылога фонду ў вёсцы і адзначалі, што гэта "лічыцца справай толькі саміх калгаснікаў" [8, с. 550]. Фактычна сяляне вырашалі свае праблемы сваімі сіламі. Аднак будаўніцтва хаты было працэсам вельмі працаёмкім, акрамя таго трэба ўлічваць гендэрны дысбаланс у пасляваеннай вёсцы. Успаміны фіксуюць, што, каб пабудаваць хату, гаспадары збіралі талаку. "*Робят тады талаку. Да, сабіраліся каторыя мужыкі такія маладзейшыя крэпкія і робілі памагалі адзін аднаму*" [3]; "(Ну вот талаку сабралі, і як хутка?)- *Ну вот паставюць, накрыюць, у нас была хата саломай крыта. Жыта што сеялі, салома, а тады шыфер*" (Ушацкі р-н) [5].

Іншы раз зруб ставілі за дзень, пры ўмове падрыхтаваных наяўных матэрыялаў: "*Так, а Вашу хату ці талакой ставілі?* – Да. Талакой. – *І як доўга будавалі, колькі*

PolotskSU



*сабраліся?* – За дзень. – *За дзень?* – За дзень. Моху самі надралі, у лес паехалі з ім моху надралі, усё прыгатовілі і, гэта, бёрны пачасаў ён усё, а тады людзі сабралі за дзень. – *За дзень паставілі?* – За дзень і паставілі. – *І страху накрылі?* – Не, страху не, гэта ўжо страху ён сам крыў, ужо дранкі гэтыя надраў ён, прыгатовіў" (Ушацкі р-н) [3]. Неабходна адзначыць, што ва ўспамінах пра першыя пасляваенныя гады ў якасці матэрыяла для стрэх часцей выкарыстоўвалася салома, чым дранка. Працэс апошняй патрабаваў пэўных рэсурсаў і быў больш працаёмкім.

Талака фіксіруецца не ва ўсіх раёнах. Большасць рэспандэнтаў узгадваюць, што будавалі хату сваімі сіламі і ў працэсе будаўніцтва прымалі ўсе члены сям'і: "*Всё цягалі папа з мамай на плечах. Цянуць, браўно завязываюць вяроўкай і цягалі. І нейкую хату зробілі. Все так строілісь, патаму шта нічогачкі не было, нічога. І я помню маленькая ездзіла і рвала ў лес эта, штоб между броўнаў лажыць - мох*" (Полацкі р-н). [9].

Успаміны пра паўнавартую сялянскую сядзібу датуюцца з большага сярэдзінай 1950-х гг., калі пачаўся пошук шляхоў, скіраваных на паляпшэнне стану сялянскага насельніцтва і перагляд сталінскай мадэлі эканамічных узаемаадносін дзяржавы з калгаснікамі. У выніку былі зменшаны падаткі, а запазычанасці з гаспадарак былі спісаны. Гэта садзейнічала паляпшэнню сітуацыі ў вёсцы і развіццю асабістых гаспадарак. Змены да лепшага знайшлі адлюстраванне ў свядомасці вяскоўцаў, якія вобразна пазначалі завяршэнне пасляваеннага аднаўлення фальклорнымі катэгорыямі "зажыліся", "закасмацелі". Паваенная сялянская сядзіба ў асноўным захоўвала структуру традыцыйнага жыллёва-гаспадарчага комплекса, уласцівага сельскаму ландшафту Беларускага Падзвіння. Аднак пэўныя гаспадарчыя пабудовы сталі знікаць, бо ва ўмовах калгаснай сістэмы страцілі сваю актуальнасць. Перш за ўсё гэта датычыла гумна, якое выкарыстоўвалася для захавання і абмалоту збожжа. Ва ўспамінах, пераважна з заходніх раёнаў Віцебшчыны, фіксуюцца змены, якія адбываліся з вёскай і сялянскай сядзібай пасля арганізацыі калгасаў: "*Тады паселкі, тады лес гэты ўжо і палы ложылі, і дамы строілі і окны малые такія і саломой крыто і вот так вот"* (Міёрскі р-н) [12]. Вывучэнне пытанняў, звязаных з тым, наколькі паваеннае вясковае дойлідства пераняло ўзоры і традыцыі даваеннага часу, і ў якой ступені было дапоўнена канструктыўнымі і тэхналагічнымі навацыямі, уяўляе сабой прадмет асобнага навуковага даследавання.

**Заключэнне.** Такім чынам, можна вызначыць умоўныя этапы аднаўлення жылых пабудоў вясковага насельніцтва на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў аднаўленчы перыяд: першыя пасляваенныя гады – экстрымальнае ці часовае жыллё (зямлянкі, лазні, гаспадарчыя памяшканні, прыстасаваныя для пражывання); рубеж 1940-х – 50-х гг. – пераходны тып жылля (міні-хата), які быў амаль пазбаўлены дэкаратыўна-мастацкага аздаблення; сярэдзіна 1950-х – пачатак 1960-х гг. – трывалая сялянская сядзіба, якая структурна і тэхналагічна адпавядала традыцыйным узорам драўлянага дойлідства Беларускага Падзвіння, за выключэннем шэрагу пэўных гаспадарчых пабудоў, якія ва ўмовах калгаснай сістэмы страцілі сваю актуальнасць.

ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 267.
2. Великая Отечественная война в зеркале народной речи и фольклора : Тексты. Исследования. Аудиоприложение / Под общ. ред. Н. В. Большаковой. – Псков : ЛОГОС, 2016. – 332 с.

PolotskSU



3. Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ) : Зап. у 2020 г. ад Жаворонок Клавдіі Сцяпанаўны, 1931 г.н., в. Лажане Ушацкага р-на.
4. ФА ПДУ : Зап. у 2017 г. ад Галоўка Анны Ігнатьевны, 1935 г.н., в. Міські Пастаўскі р-н.
5. ФА ПДУ : Зап. у 2020 г. ад Сазонавай Клаўдзіі Іванаўны, 1930 г.н., в Кублічы Ушацкага р-на.
6. ФА ПДУ : Зап. у 2019 г. ад Анцын Ефрасінні Антонаўны, 1927 г.н., в. Горспля Расонскага р-на.
7. Зап. у 2020 г. ад Аненскай Яўгеніі Васільеўны, 1933 г.н. (нар. ў в. Буды), Асвея Верхнядзвінскага р-н.
8. Восстановление сельского хозяйства Беларуси : 1943—1945 : документы и материалы / сост.: В. Д. Селеменев (отв. сост.) [и др.] ; редкол.: В. И. Кураш (отв. ред.) [и др.]. —Минск : Национальный архив Республики Беларусь, 2018. — 648 с.
9. ФА ПДУ : Зап. у 2019 г. ад Заяц Веры Васільеўну, 1937 г.н. (у Полацкім р-не), Дзісна.
10. ФА ПДУ : Зап. у 2019 г. ад Анцын Любові Іванаўны, 1937 г.н., в. Горспля Расонскага р-на.
11. ФА ПДУ : Зап. у 2019 г. ад Грыдзюшка Вольгі Аляксеевны, 1932 г.н., в. Осцевічы Міерскага р-на.
12. ФА ПДУ : Зап. у 2020 г. ад Шчарбіцкай Вольгі Паўлаўны, 1934 г.н., в. Парадні Міёрскага р-на.

PolotskSU

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2021

Об издании – 1, 2

PolotskSU

1 – дополнительный экран – сведения об издании

УДК 72(082)

Редакционная коллегия:
Р. М. Платонова (председатель),
В. В. Васильева (отв. секретарь),
Л. М. Парфенова, Е. Д. Лазовский, В. Е. Овсейчик

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ** [Электронный ресурс] : электрон. сб. ст. Междунар. науч.-практ. конф., Новополоцк, 26–27 нояб. 2020 г. / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: Р. М. Платонова [и др.]. – Новополоцк : Полоц. гос. ун-т, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-R).

ISBN 978-985-531-734-1.

Представлены итоги исследований, освещающие проблемы истории архитектуры, градостроительства и искусства, современной архитектуры, дизайна и строительства, научно-методические проблемы преподавания архитектурных, дизайнерских и строительных дисциплин.

Предназначен для специалистов в области архитектуры и проектирования, преподавателей, аспирантов, магистрантов и студентов архитектурных, дизайнерских и строительных специальностей.

*Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса.*
*Регистрационное свидетельство № 3671815379 от 26.04.2018.*

211440, ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, Беларусь
тел. 8 (0214) 59 95 11, e-mail: r.platonowa@psu.by; u.auseichyk@psu.by

**№ госрегистрации 3671815379.**
**ISBN 978-985-531-734-1** ©Полоцкий государственный университет, 2021

PolotskSU

2 – дополнительный титульный экран – производственно-технические сведения

Для создания текстового электронного издания «Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов» использованы текстовый процессор Microsoft Word и программа Adobe Acrobat XI Pro для создания и просмотра электронных публикаций в формате PDF.

**АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ**
**АРХИТЕКТУРЫ БЕЛОРУССКОГО ПОДВИНЬЯ**
**И СОПРЕДЕЛЬНЫХ РЕГИОНОВ**

Электронный сборник статей

МЕЖДУНАРОДНОЙ
НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ
(Новополоцк, 26–27 ноября 2020 г.)

Технический редактор *А. А. Прадидова.*
Компьютерная верстка *А. А. Прадидовой.*
Компьютерный дизайн обложки *Е. А. Балабуевой.*

Подписано к использованию 27.04.2021.
Объем издания: 11,4 Мб. Тираж 3 диска. Заказ 420.

Издатель и полиграфическое исполнение:
учреждение образования «Полоцкий государственный университет».

Свидетельство о государственной регистрации
издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/305 от 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 от 08.05.2014.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк,
Тел. 8 (0214) 59-95-41, 59-95-44
http://www.psu.by